УДК 778(476)“1970/1990”

# Фотаздымкі А.І. Мемуса як сродак адлюстравання гарадскіх і сельскіх вобразаў Беларусі

***Карпекін К.Р.***
*Установа “Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці”, Віцебск*

*У артыкуле аналізуюцца фотаздымкі мастака і краязнаўцы А.І. Мемуса, на якіх адлюстраваны населеныя пункты Беларусі. Згаданыя фатаграфіі былі зроблены ў перыяд другой паловы 1970-х – 1990-я гг. у час падарожжаў па краіне, і зараз у значнай колькасці яны захоўваюцца ў асабістым фондзе А.І. Мемуса Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці. Даследаваныя здымкі з’яўляюцца каштоўнымі крыніцамі па гісторыі забудовы беларускіх гарадоў, мястэчак і вёсак, бо на іх утрымліваюцца выявы мураванай і драўлянай архітэктуры, культавай, абарончай, палацавай, жылой забудовы. Пры гэтым адметнасцю зробленых фотаздымкаў з’яўляецца імкненне да максімальна падрабязнай фотафіксацыі аб’ектаў. Інфарматыўнасць фатаграфій А.І. Мемуса спалучаецца з глыбокай сімвалічнасцю, якая дасягаецца ў тым ліку шляхам прымянення матываў кантрастаў, падабенства, эфекту натуральнасці асяроддзя і інш.*

***Ключавыя словы:*** *архітэктура, вобраз, Аляксандр Іосіфавіч Мемус, сімвалізм, фотамастацтва.*

*(Искусство и культура. – 2025. – № 2(58). – С. 12–16)*

# Photographs of A.I. Memus as a Way of Illustrating Belarusian Urban and Rural Images

***Karpekin K.R.***
*Establishment “State Archive of Vitebsk Region”, Vitebsk*

*The article analyzes photographs of the artist and local historian A.I. Memus, which reflect the settlements of Belarus. The mentioned photographs were taken during the second half of the 1970s – 1990s while traveling around the country, and currently a significant number of them are stored in the State Archive of Vitebsk Region as part of the personal fund of A.I. Memus. The studied photographs are valuable sources on the history of the development of Belarusian cities, towns and villages, as they contain images of stone and wooden architecture, religious, defensive, ralace, residential buildings. At the same time, the highlight of th e photos taken is the desire to capture objects in as much detail as possible. The informative nature of A.I. Memus’ photographs is combined with deep symbolism, which is achieved, among other things, through the use of motifs of contrasts, motifs of similarities, the effect of naturalness of the environment, etc.*

***Key words:*** *architecture, image, Alexander Iosifovich Memus, symbolism, photography.*

*(Art and Cultur. – 2025. – № 2(58). – P. 12–16)*

Адной са шматлікіх граняў творчай дзейнасці мастака, краязнаўцы, грамадскага дзеяча, публіцыста і выкладчыка Аляксандра Іосіфавіча Мемуса стала захапленне фатаграфіяй. Яго падарожжы, маршруты якіх праходзілі ў значнай колькасці па Віцебшчыне, а таксама ахапілі і іншыя рэгіёны Беларусі, суправаджаліся актыўным фатаграфаваннем краявідаў, каларытных вобразаў мясцовых жыхароў і прыкметных архітэктурных аб’ектаў (апошнім і будзе нададзена ўвага ў гэтым даследаванні). Паўтары сотні фотаплёнак, створаных мастаком у другой

*Адрас для карэспандэнцыі: e-mail: karpekin07@mail.ru – К.Р. Карпекін*

палове 1970-х – 1990-я гг. – нібыта сцежкі, пройдзеныя ім, а фотакадры – як крокі апантанага краязнаўцы па вуліцах і завулках. Па паслядоўнасці кадраў магчыма прасачыць маршруты падарожніка, заўважыць, як ён набліжаецца да прывабнага яму збудавання, абыходзіць яго з усіх бакоў, захапляецца старадаўнімі інтэр'ерамі, а затым выбірае наступны аб'ект і з гэтакім сама невычэрпным пачуццём аглядае яго. Падобныя фотаздымкі з'яўляюцца вобразамі, якія прайшлі праз свядомасць мастака, яны даюць унікальную магчымасць убачыць гарады і вёскі Беларусі вачыма іншага чалавека, у пэўнай ступені дакрануцца да яго душы.

Жыхары горада, мястэчка ці вёскі ў вечных клопатах штодня прабягаюць па адных і тых жа вуліцах, не звяртаючы ўвагі на звыклыя пейзажы, і таму штодзённыя маленькія змены, якія адбываюцца з асяроддзем, застаюцца незаўважанымі. Тым часам дні складаюцца ў гады, і вось драбнюткая трэшчынка, якая толькі абазначылася на тынкоўцы, ужо пранізвае ўвесь мур. Вандроўны ж мастак сузіраў краявіды вачыма госця, што яшчэ больш абвастрала яго ўвагу. Сваімі фотаздымкамі А.І. Мемус заклікае спыніцца, хаця б на кароткі час "адрынуць" ад сябе мітуслівасць, агледзецца па баках і засяродзіцца на гарманічнай прыгажосці беларускіх гарадоў і вёсак.

У фотаздымках з выявамі тых ці іншых помнікаў архітэктуры заўважаюцца адметныя рысы, характэрныя для творчасці А.І. Мемуса як фотамастака. Вылучым асноўныя з іх, папярэдне адзначыўшы, што мастак не імкнуўся ўкладвацца ў пэўныя шаблоны, а гэтыя адметнасці сфармуляваны даследчыкам як своеасаблівым незалежным назіральнікам.

**Максімальна падрабязная фотафіксацыя аб'екта.** Дадзеная асаблівасць магла быць выклікана як мінімум двума памкненнямі: псіхалагічным і свайго роду ўтылітарным. Першае было вынікам агульнага захаплення А.І. Мемуса даўніной, роднай гісторыяй і архітэктурай як увасабленнем гэтай гісторыі. Разглядаючы кожны камень і цагліну ў мурах старадаўняга будынка ён як быццам успрымаў гэты самы будынак адной з цаглін, з якіх складаюцца беларускія векавыя традыцыі. Пры гэтым краязнаўца разумеў, што помнікі архітэктуры, як і ўсе матэрыяльныя аб'екты, не вечныя і з цягам часу могуць незваротна знікнуць. Адсюль адчуванне, што вялікая колькасць разнастайных здымкаў дасць нашчадкам магчымасць не толькі атрымаць асалоду ад сузірання архітэктурнага твора, але і пры пашкоджанні ці нават поўным разбурэнні аднавіць яго ў былой велічы і прыгажосці.

У выніку многія аб'екты былі сфатаграфаваны А.І. Мемусам з рознай адлегласці, з розных бакоў, звонку і знутры. На фотакадрах адбіліся "індывідуальныя партрэты" помнікаў архітэктуры і ў атачэнні суседніх будынкаў, а таксама іх поўны выгляд і асобныя фрагменты. Так, каля 1976 г. мастак стварыў вялікую колькасць здымкаў Троіцкай царквы ў г. Быхаве Магілёўскай вобласці, каля 1977 г. – Міхайлаўскага касцёла ў г. Навагрудку Гродзенскай вобласці і забудовы кляштара францысканцаў у г. Пінску Брэсцкай вобласці, каля 1978 г. – касцёла Нараджэння Найсвяцейшай Дзевы Марыі ў г. Верхнядзвінску Віцебскай вобласці, каля 1980 г. – касцёла дамініканцаў у в. Княжыцы Магілёўскага раёна Магілёўскай вобласці [1, арк. 1–2, 7] (мал. 1–3).

**Фатаграфаванне асобных элементаў будынкаў.** Фотаспадчына А.І. Мемуса налічвае нямала здымкаў з фрагментамі збудаванняў, зробленых наўмысна, нават калі будынак цалкам змяшчаўся ў кадр. Для мастака было важна зафіксаваць фрагменты, бо ўсе разам дробязі ствараюць цэласны вобраз, і да кожнага з іх было прыкладзена старанне дойліда. На фотаздымках – зусім розныя элементы: і разьба па дрэве, і ляпніна на мурах, і коўка па метале. Пільным поглядам мастак прыглядаўся да калон, царкоўных купалоў, дзвярэй, вокнаў… Сваімі плаўнымі выгінамі прываблівалі яго металічныя балконы і кранштэйны над уваходамі ў будынках XIX – пачатку XX ст. Такімі фотаздымкамі А.І. Мемус жадаў падкрэсліць архітэктурныя густы нашых продкаў, якія неабыякава ставіліся як да храмаў, так і да жылых дамоў. І адначасова ён выказваў захапленне вялікай стваральнай працай, калі пасля ўзвядзення сцен майстар сантыметр за сантыметрам аздабляў іх дэкорам [2, арк. 9; 3, арк. 4] (мал. 4–5).

**Цікавасць да драўлянай забудовы.** Такое стаўленне да падобнага роду архітэктуры ўласціва, відаць, пераважна выхадцам з сельскай мясцовасці. Для іх драўляная хата – гэта асяродак спакою, арганічная частка ўраўнаважанага вясковага жыцця, дзе ўсё жыве ў сугуччы з прыродай. Сельскае асяроддзе амаль не падвержана кардынальным зменам, тут не месца сумбурнасці і катаклізмам. Вядома ж, гэты спакой можа быць парушаны, калі да вёскі падкрадзецца горад, праглыне яе і драўляныя хаты адыдуць у нябыт, а на іх месцы вырастуць шматпавярховыя цагляныя гмахі, і тады ўбачыць забудову 1970–1990-х гг. мы зможам толькі вачыма фатографа.

Сельскае асяроддзе дае адчуванне прасторы і свабоды, спякотным летам драўляная

хата дорыць свайму гаспадару прахалоду, а ўзімку захоўвае для яго цяпло. Колькі дзесяцігоддзяў таму ніводны жыхар вёскі і "драўлянага" прыгарада не мог абысціся без гаспадарчых пабудоў, агарода і саду. Вакол хаты ён ствараў уласны невялікі свет, уладкоўваў свой надзел так, каб яму і яго сям'і было ўтульна. Думаецца, А.І. Мемус адчуваў гэтую энергетыку, таму кожны яго здымак з сельскай забудовай прасякнуты любоўю і замілаванасцю. На кадрах фотаплёнкі засталіся хаты, багата аздобленыя разнымі ліштвамі, узоры якіх сягаюць у часы язычніцкіх традыцый. Многія будынкі патанаюць у кветках, што буяюць на клумбах, і з'яўляюцца гонарам вясковай гаспадыні, а кожнае бярвенца драўлянай хаты выпраменьвае цяпло, накопленае дзесяцігоддзямі. Пры гэтым адценні чорна-белых фотаздымкаў выдатна падыходзяць да перадачы сельскіх вобразаў, бо шэры – гэта колер драўніны, апаленай летнім сонцам, абмытай восеньскімі дажджамі і загартаванай сцюдзёнымі зімовымі вятрамі.

У час сваіх вандровак А.І. Мемус выратаваў ад няўмольнага часу і захаваў вобразы драўлянай забудовы г. Віцебска, г. Мазыра Гомельскай вобласці, г. Бабруйска Магілёўскай вобласці, г.п. Відзы Браслаўскага раёна Віцебскай вобласці, іншых гарадоў і мястэчак, а таксама в. Старая Вадва Каменналаўскага сельскага Савета Шклоўскага раёна Магілёўскай вобласці, в. Жыровічы Слонімскага раёна Гродзенскай вобласці [4, арк. 4; 5, арк. 5] (мал. 6–7).

**Матыў кантрастаў.** У зборах А.І. Мемуса маецца нямала здымкаў, на якіх адлюстравана адначасова некалькі разнастайных аб'ектаў: гэта могуць быць і помнікі архітэктуры, і іншыя элементы гарадскога ці сельскага асяроддзя. Пры ўдумлівым сузіранні такіх фатаграфій бачна, што яны ўяўляюць сабой не проста выяву фрагмента прасторы пэўнага населенага пункта, а сапраўдную сімвалічную кампазіцыю. Адметна, што А.І. Мемус любіў злавіць у кадр супрацьлеглыя па сваёй сэнсавай напоўненасці аб'екты: мураваны храм і драўляны дом, скіраваную да неба званіцу царквы і драўляны слуп і да т.п.

Адзін з такіх фотапейзажаў быў створаны мастаком у другой палове 1970-х гг. у г. Полацку. У цэнтры кадра – драўляны жылы дом, які стаіць на зямлі, яго пабудавалі ўжо ў ХХ стагоддзі, і можна прадбачыць, што век яго будзе адносна нядоўгім. Акурат за гэтым сімвалам хуткабежнасці жыцця, насычанага побытавымі клопатамі, узвышаюцца, як бы лунаючы ў нябёсах, вежы Сафійскага сабора. Яны неаспрэчная чысціня, духоўнасць, непарушныя традыцыі, умацаваныя доўгімі выпрабаваннямі (мал. 8).

Яшчэ адзін прыклад кантрастаў – сфатаграфаваныя драўляныя жылыя дамы, залітыя сонечным святлом. Тут усё стварае ўтульнасць: ад простых вясковых фіранак на вокнах да галінак дрэў, якія судакранаюцца з абшалёванымі сценамі. І вось яны два розныя спосабы існавання: перад домам раскінулася клумба, а на падваконнях праз шкло бачны вазоны з хатнімі кветкамі. Паводле выказвання самога А.І. Мемуса, у хаце жывуць "прыручаныя" кветкі, а на вуліцы – "свабодныя".

Разважаючы пра супрацьлегласць, варта згадаць яшчэ адзін неардынарны сюжэт, заўважаны мастаком у канцы 1980-х гг. у г.п. Дзісне. Пасярод мястэчковай забудовы сабралася незвычайнае, ледзьве не сюррэалістычнае скопішча: помнік Ул.І. Леніну, воданапорная вежа, слуп з ліхтаром, комін кацельні і дашчаная будыніна незразумелага прызначэння. Усё гэтае нагрувашчванне нагадвае кучу смецця, сабранага па ўсяму мястэчку і ссыпанага на ўскраіне [6, арк. 6; 7, арк. 15] (мал. 9).

**Матыў падабенства.** У час падарожжаў А.І. Мемус ствараў не толькі фотакампазіцыі, напоўненыя ідэяй кантрастаў, але і прасякнутыя сугуччам фрагментаў гарадскога ці сельскага асяроддзя. У сваёй манеры прафесійнага і дасціпнага мастака ён фіксаваў фотакамерай аб'екты і рэчы, падабенства якіх на першы погляд можна нават не заўважыць, і напаўняў іх сімвалізмам. Стварэнне здымкаў такога зместу з'яўляецца непараўнальна больш складаным, напрыклад, за стварэнне фотанацюрморта, бо для апошняга набор прадметаў можа сабраць сам мастак, і ён жа размесціць іх у патрэбнай прасторы і паслядоўнасці. Архітэктурнае ж асяроддзе немагчыма змяніць для патрэбнага здымка, і фатограф мусіць выбіраць з таго, што ўжо ўзнікла як бы само сабою. Тут творчае майстэрства выяўляецца ў здольнасці заўважыць адно імгненне ў бясконцай хуткабежнасці часу ды выбраць крышталь з мільярда пясчынак, павярнуць яго так, каб сонца зайграла на ўсіх гранях.

Адзін з такіх крышталяў А.І. Мемус выявіў у г. Паставы Віцебскай вобласці: на здымку ён зафіксаваў шпакоўні, вежу касцёла і антэну на жылым доме. Усе гэтыя аб'екты тым ці іншым чынам звязаны з гукам: яны з'яўляюцца матэрыяльным увасабленнем птушынага спеву, звону, які заклікае на малітву, і прыёму сігналаў. Эфект падабенства ўзмацняецца тым, што пералічаныя аб'екты размешчаны

ў прасторы ўздоўж вертыкальных ліній, паралельных паміж сабой (мал. 10).

На іншым сваім здымку – з выявай Мірскага замка – мастак дэманструе сугучча паміж тварэннем чалавека і тварэннем прыроды. А.І. Мемус абраў месца для фатаграфавання такім чынам, што на пярэднім плане аказаліся тры сасны, а за імі аддзеленыя ровам з вадой муры замка. Дрэвы стаяць у адзін рад, яны вельмі падобныя паміж сабой, але ў кожнай свой узор на кары і непаўторныя галінкі. Гэтаксама і вежы замка, паводле задумы архітэктара, маюць розны дэкор, але вытрыманы ў адным стылі.

Яшчэ адзін сюжэт, у якім назіраецца падабенства паміж архітэктурным збудаваннем і дрэвам, быў знойдзены А.І. Мемусам у 1981 г. у г. Ашмяны Гродзенскай вобласці. У той час касцёл Арханёла Міхаіла, што мясціўся ў горадзе, быў не ў лепшым стане (без купалоў, з выбітымі вокнамі), але ўжо пачыналася яго рэстаўрацыя: паміж вежамі храма былі прыладжаны рыштаванні і лесвіцы. Побач з касцёлам расло дрэва, ссохлыя галіны якога нагадвалі скалечаныя вежы храма, а зялёнае лісце на астатніх галінах як быццам давала надзею на новае жыццё [8, арк. 10].

**Натуральнасць асяроддзя.** Тое, што патрапіць у кадр, залежыць ад фатографа, менавіта па яго волі на фотапаперы праяўляецца пэўная частка бязмежнай прасторы. Фотаздымкі А.І. Мемуса выглядаюць “жывымі”: на іх беларускія гарады і вёскі адлюстраваны ў сваёй натуральнай існасці, без упрыгажэння і пазбягання элементаў, якія на першы погляд маглі б падацца неэстэтычнымі. Фатаграфічныя творы А.І. Мемуса – гэта не толькі прагулка па цэнтральных вуліцах і захапленне не аднымі толькіараднымі ўваходамі, гэта яшчэ блуканне па вузкіх завулках і сузіранне аддаленых куткоў.

На многіх сваіх фотаздымках мастак наўмысна дапаўняе веліч помнікаў архітэктуры момантамі паўсядзённага жыцця, якое адбываецца вакол іх. Напрыклад, акурат пасярод горада Чачэрска, перад будынкам ратушы – сімвалам гарадскога самакіравання – крочыць жанчына з граблямі. Паколькі на дварэ сонечнае лета, верагодна, яна ідзе сушыць сена, а зараз заўважыла, што яе фатаграфуюць, і таму радасна ўсміхаецца (мал. 11).

А.І. Мемус неаднаразова наведваў Навагрудак – старажытную сталіцу Вялікага Княства Літоўскага: тут у канцы XX стагоддзя на вяршыні Замкавай гары стаялі велічныя руіны, а на яе схілах пасвіліся самыя звычайныя козы. У адзін з дзён мясцовая жыхарка прыйшла забіраць сваю жыўнасць, а адна з упартых козак зачапілася за вяроўку, капрызна падняла ножку з капытцам і ні з месца – чакае, пакуль гаспадыня разблытае яе.

Гэтаксама натуральна выглядаюць бульбяное поле каля самых муроў касцёла ў в. Княжыцы Магілёўскага раёна, бялізна, якая сушыцца ў двары па вуліцы Талстога ў г. Віцебску – у самым цэнтры горада. Прыцягваюць увагу гледача і разнастайныя шыльды савецкага часу, прымацаваныя да шматвекавых будынкаў – як быццам адна гістарычная эпоха пажадала схаваць сабой іншую. І гэтыя шыльды выглядаюць зусім недаўгавечнымі ў параўнанні з цаглянымі мурамі, якія стаялі тут ужо цягам некалькіх стагоддзяў. Напрыклад, гуляючы па г. Пінску, на сценах жылога корпуса кляштара францысканцаў А.І. Мемус заўважыў плакат “Слава ВМФ! 1917–1977”. У тым жа горадзе ў адным з будынкаў XIX ст. зрабілі краму – “Тавары па зніжаных цэнах” – і не дзіўна, што яна карыстаецца попытам у мясцовых жыхароў: адна жанчына заходзіць у краму, а другая імкліва рухаецца ў накірунку да яе. Яшчэ адзін лозунг савецкага зместу быў зафіксаваны мастаком у канцы 1970-х гг. на будынку каля Фарнага касцёла ў г. Гродна: “Імя і справа Леніна будуць жыць у стагоддзях”. Такія элементы паўсядзённага жыцця арганічна дапаўняюць вобразы населеных пунктаў Беларусі, робячы іх дынамічнымі і непаўторнымі [9, арк. 2].

**Узмацненне візуальнага эфекту.** Па фотаздымках А.І. Мемуса бачна, што яго мэтай была не проста дэталёвая фіксацыя архітэктурных аб’ектаў і захаванне іх вобліку для нашчадкаў. Стварэнне з дапамогай фатаграфіі вобразаў беларускіх гарадоў, мястэчак і вёсак спалучалася з творчай падачай выявы для гледача.

Так, фатаграфуючы царкву Аляксандра Неўскага ў г. Віцебску, мастак правёў лінію гарызонту пад нахілам, прычым пад вельмі значным вуглом. З-за гэтага здаецца, што храм разам з акаляючай яго агароджай ледзьве трымаецца на слізкім снезе, яшчэ крыху – і ён з’едзе кудысьці ў бездань. Мабыць, А.І. Мемус падобным ракурсам хацеў падкрэсліць часовасць храма (першапачаткова меркавалася, што ён будзе дзейнічаць толькі да завяршэння аднаўлення Дабравешчанскай царквы) (мал. 12).

На іншым фотаздымку А.І. Мемуса ад сузіральніка да каталіцкага касцёла ў г.п. Ушачы вядзе дарога, выцягнутая па прамой лініі. Сам жа касцёл, ці хутчэй яго руіны, змешчаны ў цэнтры кадра. Гэтая дарога рыхтуе падарожніка да сузірання храма: яна ўся пакрыта

трэшчынамі і ямінамі. Такая сцежка не можа прывесці да касцёла з новай, снежна-бялюткай тынкоўкай і яркай пазалотай, па такой сцежцы можна прыйсці толькі да знявечанага часам збудавання (мал. 13).

Арыгінальны ракурс быў знойдзены А.І. Мемусам пры фатаграфаванні замкавага мура ў г.п. Мір Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці ў пачатку 1970-х гг. Як вядома, у той час замак знаходзіўся ў неадрэстаўраваным стане, частка яго вежаў і сцен была пашкоджана. Тым не менш мастак выкарыстаў такі стан замка дзеля незвычайнай падачы яго выгляду – ён сфатаграфаваў муры з аконнымі праёмамі такім чынам, што яны наслойваюцца адзін на адзін. У выніку праз два рады абарончых сцен бачна неба, а самі яны выглядаюць як мудрагелісты лабірынт.

Акрамя таго А.І. Мемус нярэдка фатаграфаваў панарамы населеных пунктаў праз вокны царкоўных званіц ці замкавых вежаў, пры гэтым абавязкова захопліваючы ў кадр край акна. Тым самым ён падкрэсліваў дух часу: нібыта гэта не чалавек, а старадаўні будынак ужо каторае стагоддзе глядзіць на краявіды.

У шэрагу выпадкаў А.І. Мемус узмацняў прыгажосць сваіх фотаздымкаў шляхам выкарыстання воднай прасторы. Калі помнік архітэктуры знаходзіўся на беразе якогасьці вадаёма (напрыклад, ракі ці рова з вадой), краязнаўца фатаграфаваў яго ў тым ліку з адлюстраваннем у воднай роўнядзі. Вада магла быць і спакойнай, і ўсхваляванай, таму залежная ад яе выява альбо цалкам паўтарала будынак на беразе, альбо паказвала толькі яго абрысы [10, арк. 1; 11, арк. 2].

**Заключэнне.** На працягу больш як двух дзесяцігоддзяў А.І. Мемусам была створана вялікая колькасць фатаграфічных вобразаў населеных пунктаў Беларусі. Кожны кадр зроблены не выпадкова, ён з'яўляецца вынікам творчых намаганняў мастака, яго імкнення стварыць свайго роду галерэю беларускіх гарадоў і вёсак. Гэтаксама прадуманы і кожны аб'ект, замацаваны на фотапаперы побач з архітэктурным збудаваннем: ці дрэва гэта, ці кветка, ці чалавек, ці якаясьці жывёліна. Фатограф заклікае нас спыніцца ў захапленні ад імгнення, заўважыць непаўторныя драбніцы вакол сябе, ацаніць гарманічнасць быцця. Фатаграфія – адзін са сродкаў, з дапамогай якога майстар падказвае нам, што паўсядзённасць насычана вобразамі. Іншымі словамі, фотаздымкі А.І. Мемуса ўяўляюць сабой больш чым проста выяўленчыя дакументы з адлюстраваннем забудовы населеных пунктаў. Гэтыя фатаграфіі можна назваць візуальнымі рэбусамі, бо яны, фіксуючы вобразы мінулых гадоў, заклікаюць да разважанняў і пошуку сімвалаў, прыносяць эстэтычнае і інтэлектуальнае задавальненне адначасова.

**ЛІТАРАТУРА**

1. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (ДАВц). – Ф. 474. Воп. 3. Спр. 50.
2. ДАВц. – Ф. 474. Воп. 3. Спр. 20.
3. ДАВц. – Ф. 474. Воп. 3. Спр. 48.
4. ДАВц. – Ф. 474. Воп. 3. Спр. 9.
5. ДАВц. – Ф. 474. Воп. 3. Спр. 38.
6. ДАВц. – Ф. 474. Воп. 3. Спр. 22.
7. ДАВц. – Ф. 474. Воп. 3. Спр. 31.
8. ДАВц. – Ф. 474. Воп. 3. Спр. 28.
9. ДАВц. – Ф. 474. Воп. 3. Спр. 37.
10. ДАВц. – Ф. 474. Воп. 3. Спр. 15.
11. ДАВц. – Ф. 474. Воп. 3. Спр. 21.

*Паступіў у рэдакцыю 25.03.2025*